# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

**Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 29 студзеня 1998 года, чацвер, № 1 (1774)**


**Афіцыйны рэпартаж**

# Адукацыя — падмурак дабрабыту народа

*Падчас сесіі трымаюць экзамены не толькі студэнты. Да таго ж, у прафесарска-выкладчыцкага саставу экзамен куды больш сур'ёзны. Педагогам трымаць адказ за якасць вышэйшай адукацыі, а калі зірнуць на праблему шырэй, дык і за будучыню краіны. Адзнакі ў іх залікоўкі будуць выстаўлены ўжо ў наступным тысячагоддзі.*





*Праблемы развіцця вышэйшай школы былі абмеркаваны на нарадзе Прэзідэнта краіны з рэктарамі вышэйшых навучальных устаноў. Адбылася яна 15 студзеня ва універсітэце. Менавіта падчас такіх сустрэч, як зазначыў кіраўнік дзяржавы, і вызначаецца стратэгія развіцця нашай рэспублікі на працяглую перспектыву. "Сістэма вышэйшай адукацыі стала ў нас адным з важнейшых элементаў умацавання дзяржаўнай і грамадскай структур,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.— У сценах вышэйшай школы фарміруецца навуковы, вытворчы, эканамічны і кадравы патэнцыял краіны, будучае Беларусі".*

## Вышэйшая школа мае патрэбу у рэфармаванні

Выступаючы перад прысутнымі, Аляксандр Лукашэнка выказаў свае меркаванні наконт прыярытэтных напрамкаў рэфармавання вышэйшай школы, яе ролі і месца ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных і палітычных праблем нашага грамадства, а таксама шэраг прапаноў па ўдасканаленню вучэбнага працэсу і развіцця навукі ў ВНУ.

У гісторыі існуе прыклад высокай адзнакі айчыннай адукацыі ў выглядзе слоў прэзідэнта ЗША. Калі амерыканскаму лідэру паведамілі аб поспехах савецкай касманаўтыкі, ён сказаў, што справа не ў канкрэтных канструктарах, а ў паспяховасці савецкай школы канструктараў. На сённяшні дзень у беларускіх ВНУ існуюць магчымасці для стварэння паспяховай школы, прычым, у самых розных галінах. Справа толькі ў сістэме гэтага стварэння. "Я ўважліва сачу за рэфармаваннем вышэйшай школы,— сказаў Прэзідэнт.— І хоць тут ёсць пэўныя дасягненні, я пакуль не бачу цэласнасці ў гэтым працэсе. Думаю, што прыйшоў час стварыць навуковую канцэпцыю развіцця адзінай нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі, у якой быў бы прадугледжаны комплекс рэалістычных мер па ўдасканаленню ўсіх бакоў дзейнасці вышэйшай школы".

На дзяржаўным узроўні гэтую сістэму пачалі будаваць яшчэ ў мінулым годзе, калі Прэзідэнт сустракаўся з навукоўцамі, настаўнікамі, а таксама некалькі гадоў запар браў пад асабісты кантроль уступныя экзамены ў ВНУ. Падчас сустрэчы Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такі кантроль зусім не азначае ўвядзенне ў краіне абавязковай вышэйшай адукацыі. Вышэйшая адукацыя павінна заставацца дзейснай. Таму пры захаванні ільготаў для, напрыклад, абітурыентаў з чарнобыльскай зоны, нельга адмаўляцца ад сталічных школьнікаў, паколькі асноўная задача ВНУ — падрыхтаваць разумных, творчых, таленавітых спецыялістаў. Толькі рэформа, на думку Прэзідэнта, дае сістэме адукацыі здольнасць хутка рэагаваць на патрабаванні да падрыхтоўкі спецыялістаў у эканамічных умовах, якія хутка змяняюцца.

Тры асноўныя задачы неабходна вырашыць на дадзеным этапе. Гэта бесперапыннасць адукацыйнага працэсу, забеспячэнне права выбару формы навучання і ўваходжанне ў адзіную адукацыйную прастору з Расіяй, дзяржавамі СНД, краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы. Што датычыць інтэграцыі вышэйшай школы Беларусі і Расіі, то гэта магістральны накірунак. Паміж дзвюма краінамі падпісана Пагадненне аб узаемным прызнанні дыпломаў аб вышэйшай адукацыі, вучоных званняў і навуковых ступеняў. Каб гэта не было фармальнасцю, патрэбна, каб узровень падрыхтоўкі выпускнікоў нашых ВНУ не быў ніжэйшым ні па адным параметры за ўзровень падрыхтоўкі выпускнікоў расійскіх універсітэтаў. Вырашыць гэтую праблему дапаможа распрацоўка ўзгодненых з Расійскай Федэрацыяй адукацыйных стандартаў.

## Інтэлектуальны капітал на ўсё жыццё

Цяпер у рэспубліцы дзейнічаюць 56 ВНУ, у тым ліку 17 недзяржаўных. Штогод з іх сцен выходзяць больш за 30 тысяч кваліфікаваных спецыялістаў. Асаблівая роля ў фундаментальнай падрыхтоўцы кадраў надаецца навучальным установам універсітэцкага тыпу. Яны прызваны арганічна аб'яднаць у сабе якасныя параметры адукацыйнага, навуковага і культурнага цэнтраў. Гэта патрабуе новых вучэбных праграм, вызначэння перспектыўных накірункаў навуковых даследаванняў. Чатыром ВНУ — Белдзяржуніверсітэту, Беларускаму дзяржаўнаму педагагічнаму універсітэту, Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі і Беларускаму дзяржаўнаму эканамічнаму універсітэту — нададзены статус вядучых навучальных устаноў. Гэта азначае, што на іх раўняюцца пры распрацоўцы тыпавых вучэбных планаў і праграм, праектаў па фундаментальных накірунках развіцця навукі і культуры. Менавіта гэтыя ВНУ, па словах Аляксандра Лукашэнкі, у бліжэйшы час могуць разлічваць на дадатковае фінансаванне. Аднак выдзяляцца яно будзе толькі пад рэалізацыю канкрэтных праграм.

Класічныя універсітэты створаны і ў кожным рэгіёне рэспублікі. Рэгіянальным універсітэтам неабходна забяспечыць мясцовую патрэбу ў кваліфікаваных спецыялістах з вышэйшай адукацыяй. Гэтыя ВНУ павінны таксама садзейнічаць органам рэгіянальнага кіравання ў выпрацоўцы навукова абгрунтаваных падыходаў і канцэпцый, канкрэтных накірункаў развіцця абласцей. І, нарэшце, яны павінны стаць інтэлектуальнымі цэнтрамі духоўнага жыцця рэгіёнаў.

Сучасная моладзь разумее каштоўнасць ведаў і тое, што не вокамгненны камерцыйны поспех, а трывалыя веды забяспечаць інтэлектуальны капітал на ўсё жыццё. У мінулым годзе тых, хто жадаў паступіць у ВНУ, было на трэць больш, чым у даволі ўдалым 85-м годзе. Выпускнік вышэйшай школы, па меркаванню Прэзідэнта, павінен сёння мець не толькі высокія прафесійныя веды. Маладому спецыялісту неабходна кваліфікавана выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі і сучасныя віды арттэхнікі, дасканала ведаць замежную мову і свабодна валодаць дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь, умець прымаць рэалістычныя рашэнні ў рамках сучаснай палітычнай і эканамічнай мадэлі грамадства. Але самае галоўнае, у яго павінны быць устойлівыя дэмакратычныя перакананні і высокі ўзровень дзяржаўнай правасвядомасці.

*(Заканчэнне на 2-й старонцы).*



# Адукацыя — падмурак дабрабыту народа

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й старонцы).*

"Я не стану ўмешвацца ва універсітэцкую аўтаномію і вызначаць, якія грамадскія дысцыпліны і ў якіх ВНУ выкладаць, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Аднак упэўнены, што Міністэрства адукацыі разам з вядучымі грамадазнаўцамі павінна канкрэтна вызначыць кола абавязковых для вывучэння грамадазнаўчых дысцыплін у ВНУ рознага профілю. Зразумела ж, што галоўнае — гэта змест курсаў грамадазнаўчага цыкла. І тут, на мой погляд, першачарговыя наступныя патрабаванні: строгая навуковасць, аб'ектыўнасць, гістарычная праўда, адданасць патрыятычным традыцыям і маральным каштоўнасцям беларускага народа".

Вышэйшая школа прызвана выхоўваць грамадзяніна-патрыёта, здольнага ствараць у імя Айчыны. Нікуды не варта за дзяржаўныя грошы ў сценах дзяржаўнай ВНУ рыхтаваць спецыялістаў па разбурэнню роднай краіны.

## Фінансаванне

Аляксандр Лукашэнка дадаў таксама, што дзяржава бярэ на сябе абавязак падтрымліваць адукацыю і навуку. Для таго і існуе спецыяльны прэзідэнцкі фонд. За апошні год не было скарочана фінансаванне ні навукі, ні адукацыі. У гэтым — плануецца фінансаванне павялічыць, каб было яно адэкватным патрабаванням вышэйшай школы. У прыватнасці, ужо ўстаноўлена ільготнае падаткаабкладанне ВНУ.

Аднак кіраўнік дзяржавы заклікаў калектывы ВНУ вучыцца і самім зарабляць грошы. У сувязі з гэтым ён адзначыў, што ўраду і парламенту неабходна паскорыць распрацоўку законаў, якія далі б магчымасць выкарыстоўваць пазабюджэтныя сродкі для развіцця матэрыяльнай базы навучальных устаноў.

Асабліва трывожным фактам Прэзідэнт назваў рост аб'ёмаў незавершанага будаўніцтва па аб'ектах вышэйшай школы. Ён даручыў ураду ўзяць пад асаблівы кантроль будаўніцтва навучальных і лабараторных карпусоў, спартыўных залаў, студэнцкіх інтэрнатаў і кватэр для прафесарска-выкладчыцкага саставу, якія з'яўляюцца элементарнымі надзённымі патрэбамі студэнцкіх і выкладчыцкіх калектываў.



## Чаго нам не хапае?

Сучасныя падыходы да вышэйшай адукацыі патрабуюць, каб даследчыя і адукацыйныя праграмы былі прыстасаваны да зменлівых патрэб грамадства. Наша сістэма вышэйшай адукацыі аператыўна пераарыентавалася на спецыяльнасці, якімі беларуская моладзь авалодвала ў ВНУ Расіі і рэспублік былога СССР. Пачалося навучанне студэнтаў па чатырнаццаці новых спецыяльнасцях і больш чым пяцідзесяці спецыялізацыях. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на падрыхтоўку спецыялістаў па выдавецкай справе, паліграфічнаму абсталяванню і сродках апрацоўкі інфармацыі, інфарматыцы і камунікацыях, энергазберагальных тэхналогіях і энергетычнаму менеджменту. Безумоўна, калі ствараць новыя спецыяльнасці, дык гэта неабходна рабіць, улічваючы патрэбы рынка. Нельга дапусціць з'яўлення такога сацыяльнага слою, як беспрацоўныя з дыпломам. Пры гэтым дзяржава пакідае за сабой права і спытацца аб якасці адукацыі. Прэзідэнт краіны прапанаваў больш сур'ёзна падыходзіць да праблемы троечнікаў у ВНУ. Як ён заўважыў, троечнік не можа лічыцца якасным спецыялістам, а дзяржаве патрэбны менавіта якасныя. Хутчэй за ўсё, дзяржава больш сур'ёзна возьмецца і за камерцыйныя ВНУ.

— Ніхто іх зачыняць не збіраецца,— заўважыў Аляксандр Лукашэнка,— але ліцэнзіі неабходна даваць толькі тым навучальным установам, дзе ёсць дастатковая матэрыяльная база: вучэбныя памяшканні, аўдыторыі, лабараторыі, тэхнічныя сродкі навучання. Сам навучальны працэс павінен ажыццяўляцца толькі прафесіянальным выкладчыцкім калектывам, які прайшоў спецыяльнае тэсціраванне ці ў Вышэйшым атэстацыйным камітэце, ці ў Міністэрстве адукацыі.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што дзейнасць недзяржаўных навучальных устаноў павінна знаходзіцца ў сферы кантролю Міністэрства адукацыі. Ён патрабаваў ад міністра адукацыі Васіля Стражава тэрмінова разабрацца са спецыялізацыяй недзяржаўных навучальных устаноў. "Зараз яны ў асноўным рыхтуюць юрыстаў, і, як гэта ні дзіўна, спецыялістаў па знешняй палітыцы. Юных "дыпламатаў" і "юрыстаў-міжнароднікаў" недзяржаўныя ВНУ штогод выпускаюць больш, чым штатная колькасць прафесіянальных дыпламатаў у Міністэрстве замежных спраў, ва ўсіх пасольствах і міжнародных арганізацыях разам узятых. Тут ёсць і сур'ёзнае палітычнае пытанне, бо да знешнепалітычнай дзейнасці дзяржавы мы можам дапусціць не кожнага. Гэта правіла лічыцца непарушным у любой краіне".

На адно з першых месцаў у рэфармаванні вышэйшай школы ставіцца задача павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу, неперарыўнага папаўнення і абнаўлення яго ведаў.

У сваім выступленні кіраўнік дзяржавы спыніўся і на праблемах узаемадзеяння акадэмічнай і універсітэцкай навукі. Вышэйшая школа — гэта кадравы рэзерв і раўнапраўны партнёр фундаментальнай навукі, а фундаментальная навука і акадэмічныя інстытуты сваімі дасягненнямі вызначаюць перспектыўныя навуковыя арыенціры вышэйшай школы і якасны ўзровень вышэйшай адукацыі. Узаемадзеянне, якое склалася паміж універсітэцкай і акадэмічнай навукай, з'яўляецца дастаткова эфектыўным. Прэзідэнт выказаў меркаванне, што такое ўзаемадзеянне не патрабуе арганізацыйных зменаў.



Закрануў Аляксандр Лукашэнка і такое пытанне, як даступнасць вышэйшай адукацыі. Па яго меркаванні, колькасць уступных экзаменаў, від і форма іх правядзення, умовы паступлення медалістаў-выдатнікаў сярэдніх-спецыяльных навучальных устаноў і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, пераможцаў алімпіяд і конкурсаў, выпускнікоў падрыхтоўчых аддзяленняў павінны вызначаць навучальныя ўстановы. Акрамя таго, неабходна забяспечыць прыярытэт падчас прыёму ў ВНУ лепшых выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў на скарочаны тэрмін навучання пры ўмове іх паступлення на профільныя факультэты.

## Аб падручніках і не толькі

Яшчэ адна праблема, на якой Прэзідэнт засяродзіў увагу ўдзельнікаў нарады, — стан бібліятэк ВНУ і выданне падручнікаў для студэнтаў. Таму што на працягу 1994-1997 гадоў ні разу не быў выкананы дзяржаўны заказ на выданне падручнікаў для ВНУ, тэхнікумаў і прафтэхвучылішчаў. Аляксандр Лукашэнка выказаўся за неабходнасць распрацоўкі нарматыўнай базы, якая б адлюстроўвала дзяржаўную палітыку ў пытаннях кнігавыдання і камплектавання бібліятэк ВНУ і школ. Акрамя таго, ён даручыў Мінфіну штогод выдаткоўваць Міністэрству адукацыі сродкі пад зацверджаны дзяржаўны заказ на выданне падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў і ўдакладніць парадак вызначэння цэн і памераў датацыі на малатыражную вучэбную літаратуру для ВНУ, тэхнікумаў і прафтэхвучылішчаў, каб яна была даступнай навучэнцам і выкладчыкам.



## Прапановы на будучыню

У нарадзе прымалі ўдзел не толькі рэктары дзяржаўных і недзяржаўных ВНУ, але і кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, ад якіх непасрэдна залежыць паспяховае развіццё нацыянальнай вышэйшай школы.

Міністр адукацыі Васіль Стражаў падкрэсліў у сваім выступленні, што менавіта 1998 год стане годам канкрэтнай распрацоўкі канцэпцыі вышэйшай школы рэспублікі. Яе важнейшая задача — вызначыць накірункі далейшага руху і захаваць усё тое добрае, што ўжо набыта вышэйшымі навучальнымі ўстановамі за многія гады работы. Старшыня савета рэктараў краіны рэктар Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі Міхаіл Дзямчук спыніўся на неабходнасці павышэння якасці сённяшняй падрыхтоўкі спецыялістаў, пашырэнне ільготаў для вышэйшых навучальных устаноў па мытных падатках на ўвозімую тэхніку і неабходную апаратуру. Адным з варыянтаў вырашэння гэтай праблемы Міхаіл Дзямчук назваў стварэнне ВНУ адкрытага тыпу, са сваімі навукова-вытворчымі лабараторыямі, заводамі, прадпрыемствамі. Такі падыход падтрымаў і рэктар Беларускай акадэміі мастацтваў Рычард Смольскі, які прапанаваў арганізаваць пры творчых ВНУ майстэрні і сцэнічныя пляцоўкі. У працяг размовы рэктар Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі Аляксандр Цыганоў лічыць неабходным ствараць пры аграрных ВНУ асабістыя вопытныя гаспадаркі.

Галоўнай задачай рэгіянальных ВНУ рэктар Віцебскага дзяржаўнага універсітэта Аркадзь Русецкі назваў павышэнне якасці навучальнага працэсу. А яго калега з Магілёва Міхаіл Аўласевіч выказаўся за актывізацыю пошуку таленавітай моладзі, неабходнасць аказання ёй усеагульнай падтрымкі. Прэзідэнт Нацыянальнай Акадэміі навук Аляксандр Вайтовіч запэўніў рэктараў, што акадэмічная навука не пакіне без сваёй увагі навуку ВНУ.

Усе ўдзельнікі нарады сышліся на тым, што праблемы рэформаў заўсёды былі актуальнымі, таму што ў іх ёсць пастаянная патрэба. Навучанне ж — гэта жывы арганізм, які павінен развівацца і ўдасканальвацца.

Напрыканцы сустрэчы, якая доўжылася значна больш запланаванага часу, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе прапановы і заўвагі, якія прагучалі на нарадзе, будуць вельмі ўважліва разгледжаны, а пытанні, рашэнне якіх залежыць ад Прэзідэнта, вырашаны.

А ў тым, што вышэйшая школа і яе навука — гэта велізарны патэнцыял дзяржавы ў развіцці не толькі фундаментальных навук, але і народнай гаспадаркі рэспублікі, Аляксандр Лукашэнка мог упэўніцца асабіста, наведаўшы выставу дасягненняў беларускіх вышэйшых навучальных устаноў. Ён таксама азнаёміўся і з паланам рэканструкцыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта і універсітэцкага гарадка.

*Эдуард ПІВАВАР, БелТА,*
*Марына АВЕРКІНА,*
*"Беларускі універсітэт"*

# У вядучай ВНУ — новыя задачы

***Згодна з Загадам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 342 ад 29.08.96 "Аб наданні БДУ статуса вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь", за апошнія некалькі месяцаў праведзена работа па ўпарадкаванню структуры і штатаў Белдзяржуніверсітэта. Якія змены ўжо адбыліся і што плануецца зрабіць у бліжэйшы час? Пра гэта наш карэспандэнт гутарыць з начальнікам планава-эканамічнага ўпраўлення Аленай Самуілаўнай БЯЛЕВІЧ.***

**— Пачнем з таго, што ва універсітэце апошнім часам з'явілася шмат новых падраздзяленняў. Чым гэта абумоўлена?**

— Зразумела, патрабаваннем часу. Вось, скажам, створаны ў нас Цэнтр праблем развіцця адукацыі. Яго мэтай з'яўляецца пошук новых падыходаў да адукацыі, распрацоўка і адаптацыя перспектыўных адукацыйных тэхналогій і правядзенне адзінай палітыкі па іх укараненню ў навучальны працэс. Чаму спатрэбілася такое пераўтварэнне? Таму што гэтая структура вырашае задачы распрацоўкі стратэгіі развіцця не толькі універсітэцкай, але і нацыянальнай адукацыі ўвогуле.

На аснове рэдакцыйна-выдавецкай групы, рэдакцыі газеты "Беларускі універсітэт", друкарні і лабараторыі памнажальнай тэхнікі сфарміраваны Выдавецкі цэнтр. Галоўным накірункам яго дзейнасці з'яўляецца выданне вучэбнай і навуковай літаратуры, вучэбна-метадычных і даведачных дапаможнікаў, бланкачнай прадукцыі, стварэнне электронных дапаможнікаў. Цэнтр не проста ўвабраў у сябе ўсе былыя падраздзяленні, а дазволіць узняць на больш высокі ўзровень выдавецкую дзейнасць у БДУ, у чым даўно адчувалася патрэба. Да таго ж, на паліграфічнай базе Выдавецкага цэнтра плануецца выданне



часопісаў "Веснік БДУ", "Сацыялогія", "Прадпрымальніцтва ў Беларусі", "Фокус" і газеты "Беларускі універсітэт".

Рэарганізаваны і вылічальны цэнтр БДУ. Цяпер гэта Цэнтр інфармацыйных тэхналогій. Ен працуе над стварэннем і развіццём адзінай інфармацыйнай сеткі універсітэта, а таксама над забеспячэннем яе інтэграцыі ў рэспубліканскія і міжнародныя сеткі. Сярод накірункаў дзейнасці гэтага Цэнтра — выкананне даследчых работ у мэтах інфармацыйнага забеспячэння навучальнага працэса і кіравання універсітэтам, прадастаўленне сеткавых і вылічальных рэсурсаў навуковым падраздзяленням БДУ, праектаванне, стварэнне і развіццё аўтаматызаванай сістэмы кіравання БДУ. На сённяшні дзень менавіта ва універсітэце вядзецца работа па стварэнню камунікацыйнай сеткавай інфраструктуры. Іншыя ВНУ рэспублікі пакуль не могуць пахваліцца яе наяўнасцю.

**— А таксама і даверам, які аказаў нашаму універсітэту Еўрапейскі Саюз...**

— Сапраўды. Цэнтр Еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі (ЦЕДІ), які ўжо зараз спрыяе распаўсюджванню інфармацыі аб дзейнасці Еўрапейскага Саюза сярод грамадскасці, азнаямленню з праектамі і праграмамі Еўрапейскага Саюза, быў створаны ў БДУ летам мінулага года. ЦЕДІ камплектуе, апрацоўвае і захоўвае міжнародную інфармацыю. Акрамя таго, ён інфармацыйна і арганізацыйна падтрымлівае навучальныя ўстановы ў развіцці прыкладных і навуковых даследаванняў у сферы еўрапейскай інтэграцыі.

Працягнем? У мэтах развіцця сацыялагічнай навукі ва універсітэце, якаснага забеспячэння навучальнага працэсу, а таксама правядзення сацыялагічных даследаванняў па актуальных праблемах жыцця грамадства створаны Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў. Для камерцыялізацыі навукова-тэхнічных дасягненняў БДУ арганізаваны Цэнтр маркетынгавых даследаванняў.

На базе лабараторыі квантавай электронікі НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ для правядзення навуковых даследаванняў у галіне праблем захавання азонавага слою і прадастаўлення інфармацыі зацікаўленым арганізацыям, распрацоўкі і канструявання новай вымяральнай апаратуры для маніторынгу азонасферы, створаны Нацыянальны навукова-даследчы Цэнтр маніторынгу азонасферы.

**— Паколькі БДУ прызнаны вядучай ВНУ рэспублікі, які вопыт, магчыма, спатрэбіцца і іншым. Ці прадугледжана гэта?**

— Таму і створана навукова-даследчая лабараторыя аналізу эфектыўнасці дзейнасці вядучай ВНУ і выпрацоўкі рэкамендацый па паляпшэнню даследавання вучэбнага, навуковага і вытворчага патэнцыялу.

Дарэчы, у структуру БДУ пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1389 ад 20.10.97 года перададзена і Беларускае навукова-вытворчае аб'яднанне машынабудавання "Комплекс".

**— Навошта?**

— З мэтай павышэння эфектыўнасці выкарыстання навуковага патэнцыялу БДУ, павышэння узроўню падрыхтоўкі студэнтаў па пытаннях арганізацыі і функцыяніравання сучаснай рынкавай эканомікі, укаранення навуказберагальных, высокатэхналагічных распрацовак універсітэта, скіраваных у першую чаргу на выпуск навукаёмістай канчатковай прадукцыі і яе рэалізацыю. У стадыі стварэння знаходзіцца зараз навучальна-навукова-вытворчае аб'яднанне (прадпрыемства), а таксама навукова-вытворчы цэнтр па праблемах малатаннажнай хіміі.

**— Нікога мы з вамі не прапусцілі?**

— Здаецца, не. А для больш поўнага знаёмства з дзейнасцю структурных падраздзяленняў БДУ будзе выдадзены зборнік Палажэнняў і Статутаў усіх структурных падраздзяленняў БДУ, на аснове якога яны дзейнічаюць. Увогуле ж структура Белдзяржуніверсітэта застаецца цэласнай і непадзельнай.

**— Адбыліся змены і ў фінансаванні універсітэта. Як гэта адбілася на дабрабыце асобных факультэтаў, выкладчыкаў, студэнтаў?**

— Цяпер фінансаванне універсітэта ажыццяўляецца праз сістэму казначэйства Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь, што значна ўздымае адказнасць фінансавых службаў універсітэта пры фарміраванні бюджэта на наступны фінансавы год. Аб'ём фінансавання ў 1997 годзе павялічыўся амаль у тры разы. Хаця патрэба ў грашовых сродках на утрыманне універсітэта ў мінулым годзе была значна вышэйшай. Нічога не зробіш — высокі ўзровень адукацыі патрабуе вялікіх выдаткаў. Таму БДУ прыцягвае яшчэ сродкі і за кошт платных адукацыйных паслуг. Упершыню распрацаваны нарматыўныя дакументы, накіраваныя на павышэнне эканамічнай самастойнасці і адказнасці факультэтаў у выдаткаванні бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў.

Што ж датычыць кожнага асобнага супрацоўніка, то на яго сямейным бюджэце змены адбіліся толькі лепшым чынам. Заработная плата прафесарска-выкладчыцкага саставу і педагагічных работнікаў у БДУ на 70 працэнтаў вышэй, чым у іншых ВНУ рэспублікі, стыпендыя студэнтаў і аспірантаў — на 20 працэнтаў. Каб сацыяльна падтрымаць работнікаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта, матэрыяльна зацікавіць іх у выніках працы, выдаткоўваюцца бюджэтныя асігнаванні ў памеры 50 працэнтаў планавага фонду заработнай платы.

*Гутарыла Марына АВЕРКІНА*

Новыя тэхналогіі

# Універсальныя сістэмы камп'ютэрнай матэматыкі

***У апошняй публікацыі з серыі кароткіх аглядаў найбольш распаўсюджаных сістэм камп'ютэрнай матэматыкі размова пойдзе аб, здаецца, найбольш дасканалай на сённяшні дзень сістэме Mathematica 3.0 (парыхільнікі Maple могуць заставацца пры сваім меркаванні).***

Універсальны матэматычны пакет Mathematica распрацаваны амерыканскай кампаніяй Wolfram Research, заснаванай вядомым фізікам і матэматыкам Стэфанам Вальфрамам у жніўні 1987 года. Першая версія пакета была афіцыйна выдадзена ў чэрвені 1988 года на платформе Macintosh і адразу атрымала водгукі як грунтоўнае ўдасканаленне ў сферы вылічэнняў. Амаль праз паўгода была выпушчана версія Mathematica для камп'ютэраў з MS-DOS. З тых часоў версіі сістэмы распрацаваны больш чым для 20 камп'ютэрных апаратных сродкаў і аперацыйных сістэм, уключаючы Macintosh, Microsoft, Windows, Windows NT, OS/2, Linux, NEXTSTEP, Open VMS, Unix і Convex.

Стваральнікі Mathematica абралі за мэту аб'яднаць усе вядомыя матэматычныя (як аналітычныя, так і лікавыя) метады рашэння навуковых задач у ўзгодненым выглядзе. Аднак шырокую папулярнасць сістэма набыла толькі пасля выпуску ў 1991 годзе другой версіі, у якой былі ліквідаваны многія памылкі і зменены інтэрфейс.

Да моманту выхаду ў 1996 годзе версіі Mathematica 3.0 у свеце ўжо было зарэгістравана звыш за мільён пастаянных карыстальнікаў сістэмы.

Спачатку магчымасці Mathematica былі выпрабаваны галоўным чынам у фізічных навуках, праектаванні ў матэматыцы. Але за гады існавання сістэма стала важным інструментам у выключна шырокім спектры. Mathematica выкарыстоўваецца сёння ў фізіцы, біялогіі, сацыялогіі ды іншых навуках і сярод сваіх аднадумцаў налічвае многія перадавых вучоных свету. Пакет адыграў вызначальную ролю ў многіх важных адкрыццях і стаў асновай для тысяч тэхнічных артыкулаў. У тэхніцы Mathematica стала стандартным інструментам як для распрацоўкі, так і для вытворчасці.

Цяпер многія з новых праграм разлічваюць у той ці іншай ступені на Mathematica. У гандлі Mathematica адыграла значную ролю ў выкарыстанні складанага фінансавага мадэліравання, у той жа час яна шырока выкарыстоўваецца ў многіх відах агульнага планавання і аналізу. Mathematica таксама з'яўляецца важным інструментам у распрацоўцы праграмнага забеспячэння і інфарматыцы: моўны кампанент праграмы шырока выкарыстоўваецца як асяроддзе для даследавання, стварэння прататыпаў і інтэрфейсаў.

Паколькі Mathematica — адкрыты праграмны прадукт, яна можа быць мадэрнізавана самім карыстальнікам. Ужо распрацавана мноства спецыялізаваных дадаткаў, якія пашыраюць магчымасці прымянення праграмы ў розных галінах дзейнасці. Разам з Maple і Mathcad сістэма Mathematica выкарыстоўваецца многімі навучальнымі ўстановамі — як тэхнічнымі, так і гуманітарнымі — у якасці базавага прадукта для выкладання курса матэматыкі.

Mathematica складаецца з дзвюх асноўных частак — ядра, якое праводзіць вылічэнні па зададзеных камандах, і інтэрфейснага працэсара, які задае знешняе афармленне і характар узаемадзеяння з карыстальнікам і сістэмай. Уся работа ажыццяўляецца ў акне рабочага дакумента — нататніка (notebook), знешні выгляд якога залежыць ад тыпу платформы і вызначаецца інтэрфейсным працэсарам, асобным для кожнай платформы. Нататнік можа ўтрымліваць розныя матэматычныя і спецыяльныя сімвалы, графічныя аб'екты. Аднак унутранае прадстаўленне дакумента, з якім працуе ядро праграмы,— заўсёды нефарматаваны тэкст. Гэта дазваляе лёгка пераносіць дакументы з адной платформы на другую. Больш таго, можна працаваць і ў тым выпадку, калі інтэрфейсны працэсар запускаецца на адной машыне (напрыклад, IBM PC), а вылічальнае ядро — на больш магутным камп'ютэры.

Інтэрфейс праграмы для карыстальнікаў складаецца з радка меню, акна рабочага дакумента і некалькіх кнопкавых палітраў, якія настройваюцца. Апошнія дазваляюць выконваць розныя функцыі без уводу з клавіятуры, а таксама прадстаўляюць магчымасць увядзення каля 700 розных спецыяльных сімвалаў — матэматычных і моўных.

У сістэме прадугледжана прымяненне розных стыляў экраннага афармлення, рабочых дакументаў і выводаў іх на друк, магчыма стварэнне гіпертэкставых сувязей. Нататнік можна пераўтварыць у фармат WWW — дакумента, у фармат паліграфічнай мовы, La Text і некаторыя іншыя. Нататнікі Mathematica ужо сталі стандартам для многіх відаў дакументаў і справаздач. З магчымасцямі, якія з'явіліся ў Mathematica 3.0, яны могуць стаць агульным стандартам для публікацыі тэхнічных дакументаў у Інтэрнэце.

Асноўная вартасць сістэмы — правядзенне аналітычных разлікаў. Трэцяя версія "здольная" спрошчваць матэматычныя выразы, у тым ліку і тыя, што утрымліваюць спецыяльныя функцыі, знаходзіць вызначаныя і нявызначаныя інтэгралы. Ёсць магчымасць задаваць сферу змены параметраў у падінтэгральных выразах, што дазваляе інтэграваць многія выразы, у агульным выпадку не маючы першаўзорнай. У параўнанні з папярэдняй версіяй значна пашыраны дыяпазон аналітычных концых і бясконцых сум і ўтварэнняў, звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў, а таксама ўраўненняў у асобных вытворных.

Акрамя таго, сістэма аснашчана магутнымі інструментамі работы са спісамі, радкамі, унутранай мовай праграміравання, здольнай апераваць вельмі шырокім спектрам аб'ектаў, а таксама вялікай колькасцю алгарытмаў для правядзення лікавых разлікаў.

Mathematica дазваляе выкарыстоўваць ў разліках вялікую колькасць убудаваных функцый: пакет утрымлівае ўсе вядомыя элементарныя і сотні спецыяльных функцый. Карыстальнік можа таксама дадаць свае функцыі — як на час аднаго сеанса работы, так і для пастаяннага карыстання.

Нельга не ўспомніць аб графічных магчымасцях сістэмы. У Mathematica можна будаваць двух- і трохмерныя графікі самых розных тыпаў, падбіраючы пры гэтым колер, памеры, асветленасць аб'екта, які разглядаецца, і многія іншыя параметры. Магчыма таксама будаваць серыю выяў, якія будуць успрымацца як анімацыя. Прадстаўленне графічных выяў аб'ектаў ажыццяўляецца на мове старонкавага апісання Post Script і пераводзіцца ў графічны фармат інтэрфейсным працэсарам сістэмы. Дзякуючы гэтаму, нататнікі Mathematica, якія утрымліваюць графікі, не залежаць ад канкрэтнай вылічальнай платформы.

Mathematica 3.0 забяспечана наборам стандартных дадаткаў, якія ўключаюць у сябе падпраграмы для паглыбленай работы ў галіне алгебры, аналітычных і лікавых разлікаў, графікі, дыскрэтнай матэматыкі, тэорыі лічбаў, статыстыкі.

Акрамя таго, для Mathematica распрацавана вялікая колькасць спецыялізаваных дадаткаў — пакетаў, якія дазваляюць пашырыць магчымасці праграмы ў спецыяльных галінах: Time Series, Fuzzy Logic, Optica, Finance Essentials, Structural Maechanics і інш.

Для працы з Windows - версіяй сістэмы Mathematica 3.0 патрабуюцца: працэсар Intel 80386 (ці старэйшы), аперацыйная сістэма Windows 95 ці Windows NT 3.51 (і старэйшая), мінімальная дыскавая прастора 24 Мб ( рэкамендуецца 83 Мб), мінімальная аператыўная памяць 8 Мб (рэкамендуецца 16 Мб). Сістэма распаўсюджваецца на кампакт-дыску ў камплекце з поўнай электроннай дакументацыяй і падручнікам.

*Сяргей ЗЯМСКОЎ,*
*Цэнтр інфармацыйных тэхналогій БДУ*

Юбілей

# Героі вяртаюцца ў строй

***12 студзеня ў Белдзяржуніверсітэце ладзілася ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 80-годдзю з дня нараджэння доктара гістарычных навук, прафесара, Героя Савецкага Саюза Дзмітрыя Пятровіча Жмуроўскага.***

Больш за 30 гадоў Дзмітрый Пятровіч працаваў у нашым універсітэце. У 1941 годзе ён скончыў трэці курс Магілёўскага педінстытута. Але вайна перапыніла вучобу. У верасні 1944 года Жмуроўскаму за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны — Маскоўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, абарона кандыдацкай дысертацыі. З канца 50-х гадоў Дзмітрый Пятровіч працаваў ва універсітэце на кафедры гісторыі БДУ. У 1972 годзе абараніў доктарскую. У 1975 — стаў прафесарам.

Шмат цёплых слоў калегі і сябры выказалі Дзмітрыю Пятровічу з нагоды юбілея. Прывітальны адрас ад Аляксандра Лукашэнкі перадаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый Маркавіч Харавец. Самую вышэйшую ўзнагароду Міністэрства адукацыі — "Выдатнік асветы Рэспублікі Беларусь" і грашовую прэмію ўручыў намеснік міністра Алег Георгіевіч Слука. Ад рэспубліканскай ветэранскай арганізацыі Дзмітрый Пятровіч атрымаў сувенірны гадзіннік. Шчыра віншавалі свайго паплечніка Героі Савецкага Саюза Аляксандр Андрэевіч Філімонаў і Мікалай Якаўлевіч Зайцаў. Ад беларускага рэспубліканскага таварыства "Веды" намеснік старшыні Канстанцін Канстанцінавіч Украінец за шматгадовую плённую працу на ніве навукова-асветніцкай і адукацыйнай дзейнасці і ў сувязі з 50-годдзем таварыства "Веды" ўручыў Д. П. Жмуроўскаму ганаровую грамату — першаму сярод вялікага лектарскага актыву БДУ. З нагоды дня нараджэння выступілі і спеўны гурт "Тутэйшая шляхта".

Ад БДУ Д.П. Жмуроўскі таксама атрымаў каштоўны падарунак і грашовую прэмію. Акрамя таго, як паведаміў першы прарэктар П.І. Брыгадзін, прынята рашэнне аб вяртанні Дзмітрыя Пятровіча ў штат супрацоўнікаў БДУ.

*Таццяна КУХАРЧУК*



*Фота Івана ПУШЫНОВІЧА*

А ў вас!
А ў нас!

# Калі вучоба і як свята

Трэці год працуе на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта невялікае, але вельмі здольнае і актыўнае ўкраінскае аддзяленне. Працуе, акружанае асаблівай увагай кіраўніцтва факультэта і універсітэта, у цесным кантакце з Пасольствам Украіны ў Беларусі і ўкраінскай дыяспарай. Розныя формы выкарыстоўваюць выкладчыкі для таго, каб на іншай культурнай і моўнай прасторы дзесяць беларускіх хлопцаў і дзяўчат як след спасціглі і мову, і культуру братняй Украіны. Напрыклад, дацэнт Т.В. Кабржыцкая, якая з першага курса выкладае па-ўкраінску курс гісторыі ўкраінскай літаратуры, кожны год, карыстаючыся рознымі нагодамі, наладжвае сустрэчы будучых украіназнаўцаў з пісьменнікамі, культурнымі і навуковымі дзеячамі Украіны. На ўсё жыццё запомнілі студэнты пазалеташнюю сустрэчу з выдатнай украінскай паэтэсай Лінай Кастэнка, леташнюю — з Наталкай Белацарковец, Максімам Стрыхам, Уладзімірам Цыбулько і іншымі.

Выкладчыца практычнага курса ўкраінскай мовы Г.П. Сапсай звяртаецца да такой формы развіцця маўлення і замацавання пройдзенага матэрыялу, як правядзенне нацыянальных украінскіх святаў. У прыватнасці — Каляд.

Трэці раз ужо ладзяцца ўкраінскія калядкі на філфаку БДУ. Трэці раз запрашаюцца на іх не толькі выкладчыкі факультэта, але і дарагія госці — супрацоўнікі ўкраінскага пасольства, апранутыя ў нацыянальныя строі галасістыя харысты ўкраінскіх зямляцтваў. А студэнты — таксама ў прыгожых народных строях — выступаюць у вобразе калядніцаў, інсцэніруюць некаторыя творы украінскіх пісьменнікаў, чытаюць вершы на ўкраінскай мове. Усе пры гэтым — і выкладчыкі, і госці філфака — выступаюць у ролі своеасаблівых экзаменатараў, прымаюць у іх экзамен па практыцы ўкраінскага маўлення...

Сёлетнія калядкі прайшлі гэтак жа цікава, як і папярэднія. Студэнты паказалі добрае валоданне ўкраінскай мовай (адчулася і тое, што яны мінулай восенню прайшлі месячную стажыроўку ў Кіеўскім універсітэце), і ім за маўленне ўсе прысутныя аднадушна паставілі "выдатна". Галасіста, як і раней, ліліся цудоўныя украінскія народныя песні (спявалі на гэты раз харысты з таварыства "Ватра" і Цэнтра ўкраінскай песні "Січ"). Але былі і неспадзяванкі. Прафесару В.П.Рагойшу прыгатавалі студэнты прыемны сюрпрыз: паставілі сцэну з драмы-феерыі Лесі Украінкі "Лясная песня" ў яго ным перакладзе на беларускую мову. А Надзвычайны і паўнамоцны Пасол Украіны У.І. Жаліба, які шмат зрабіў для арганізацыі і плённай працы ўкраінскага аддзялення, выступаючы, са шкадаваннем паведаміў, што гэтыя калядкі — яго развітальны вечар са студэнтамі: заканчыўся тэрмін пабыўкі ў Беларусі...

*В. Качановіч*

Віншуем!

# З групы "В" у групу "А"

З 28 снежня мінулага года па 4 студзеня 1998 у польскіх гарадах Саснаўцы і Тыхом праходзіў чэмпіянат свету па хакею групы "В" сярод маладзёжных зборных. У ім брала ўдзел і маладзёжная зборная нашай краіны. Для нашых хакеістаў чэмпіянат прайшоў цудоўна, як пацвярджэнне — 1-е месца ў групе і выхад у эліту сусветнага маладзёжнага хакея — групу "А", дзе саnapнікі куды больш сур'ёзныя. Дарэчы, у мінулым годзе на чэмпіянаце свету зборная перайшла з групы "С" у групу "В". Ва ўсіх гульнях добра паказаў сябе варатар Леанід Грышукевіч (кандыдат у нацыянальную зборную XXI стагоддзя), за што быў узнагароджаны як лепшы варатар чэмпіянату. Дарэчы, у камандзе выступаў і студэнт IV курса факультэта журналістыкі нашага універсітэта Аляксей Цітавец.

Праграма гульняў была вельмі насычанай: за ўвесь час на адпачынак хакеістам было адведзена ўсяго два дні. Нават Новы год каманда сустракала ў спартыўным рэжыме — 1 студзеня была гульня.

Ігракі прызналіся, што вялікую падтрымку ў захаванні баявога духу аказвалі балельшчыкі з Беларусі, спецыяльна накіраваныя на чэмпіянат Нацыянальнай Федэрацыяй хакея і ЦК БПСМ.

Зборная атрымала золата. Вынікі матчаў гавораць самі за сябе:
Польшча — Беларусь — 1 : 4;
Нарвегія — Беларусь — 3 : 0;
Украіна — Беларусь — 2 : 2;
Венгрыя — Беларусь — 0 : 8;
Латвія — Беларусь — 1 : 3;
Францыя — Беларусь — 4 : 5.

У выніку, Беларусь — 1-е месца, Украіна — 2-е, Польшча — 3-е, Латвія — 4-е, Венгрыя — 5-е, Францыя — 6-е, Нарвегія — 7-е, Японія — 8-е.

Беларускую маладзёжную зборную чакае праз год вельмі сур'ёзнае выпрабаванне — дэбют у групе "А" сусветнага чэмпіянату, які пройдзе ў канадскай правінцыі Манітоба.

*Павел СКАЛАБАН,*
*сакратар камітэта БПСМ БДУ.*

ДАІ паведамляе

# Без праў не маеш права

Усяго за 1997 год па Мінску выяўлена 872761 парушальнікаў дарожнай дысцыпліны. У нецвярозым стане здзейснена 8082 парушэнні. Дарожна-транспартных парушэнняў зафіксавана 8007. Затрымана за перавышэнне хуткасці 128207 вадзіцеляў, за кіраванне аўтатранспартам без вадзіцельскіх праў — 11291 чалавек. Парушэнняў дарожнай дысцыпліны пешаходамі выяўлена 296758.

У Маскоўскім раёне лічбы выглядаюць так: парушэнняў дарожна-транспартнай дысцыпліны 89924, 859 ДТП, 991 парушальнік быў у нецвярозым стане.

Затрымана за перавышэнне хуткасці 13230. Сярод пешаходаў выяўлена 30317. За кіраванне аўтатранспартам без вадзіцельскіх праў затрымана 1440 чалавек.

У нецвярозым стане быў затрыманы І. М.Мойсан, які здзейсніў ДТП у раёне праспекта Дзяржынскага — наезд на машыну, якая стала, разам з ім у машыне знаходзіўся яе гаспадар Ю.В.Гудэнка Абдва да гэтага прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане без вадзіцельскіх праў. На гэты раз матэрыял перададзены ў суд Маскоўскага раёна.

Па Маскоўскаму раёну ў мінулым годзе здзейснена 9 ДТП з удзелам дзяцей. Восем з іх былі па віне малых.

Ёсць парушэнні дарожнай дысцыпліны ў снежні 1997 года работнікамі і студэнтамі БДУ. Гэта дацэнт Ш.Л.Васільеў, а студэнты А.Галдога, А.Петрачоў.

Паважаныя супрацоўнікі і студэнты, калі ласка, будзе дысцыплінаванымі на дарогах.

*Дзяржаўтаінспектар ДАІ Маскоўскага раёна*
*Мікалай СКОПАР.*

Акцыі

# Калядная ёлка ў сценах БДУ



На пачатку студзеня рэктарат БДУ, дырэкцыя па справах культуры, упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю, камітэт БПСМ, прафкомы супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ, Асацыяцыя шматдзетных сем'яў Мінска ладзілі калядную праграму для дзяцей супрацоўнікаў БДУ і шматдзетных сем'яў сталіцы. Яна праходзіла ў рамках рэспубліканскай праграмы "Нашы дзеці". Вясёлыя жарты, гульні, атракцыёны, розыгрышы, карагоды каля прыгажуні-ёлкі ў актавай зале галоўнага корпуса былі са-праўдным калядным сюрпрызам для маленькіх мінчан. Парадаваў сваім выступленнем і дзіцячы харэаграфічны ансамбль Белдзяржуніверсітэта "Літарынка". Акрамя таго, усе дзеці напярэдадні атрымалі салодкія падарункі.

*Эдуард ВЛАСАЎ,*
*член камітэта БПСМ БДУ.*



# Вынікі года

Вынікі чарговай, сорак пятай па ліку спартакіяды сярод факультэтаў БДУ падводзіліся на спартыўным вечары. З гэтай нагоды ў актавай зале філалагічнага корпуса сабралася амаль уся спартыўная грамадскасць універсітэта. Вечар адкрыў загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Сяргей Уладзіміравіч Макарэвіч. Ён зрабіў даклад пра дасягненні студэнтаў БДУ. А працягнуў афіцыйную частку прафесар Вадзім Максімавіч Кісялёў, зачытаўшы загад, дзе пераможцам спартакіяды названы юрыдычны факультэт (адказны за фізвыхаванне Уладзімір Сяргеевіч Фралоў). На другім месцы — факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (Уладзімір Мікалаевіч Лятун). І трэцяе месца — за механіка-матэматычным факультэтам (Анатоль Сяргеевіч Балдзін).

Лепшай спартсменкай прызнана студэнтка 1-га курса ФПМІ, бронзавы прызёр першынства па міжнародных шашках, майстар спорту Людміла Воўкава. Лепшы спартсмен года — студэнт 4-га курса геафака чэмпіён міра па грэка-рымскай барацьбе Сяргей Жардзіцкі. І лепшы трэнер-выкладчык — дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту, заслужаны трэнер СССР Віктар Аляксандравіч Рудэнкоў.

Пасля афіцыйнай часткі пачаўся канцэрт, які з запалам правяла студэнтка факультэта журналістыкі Ала Дамарацкая. Гледачы пабачылі сольныя выступленні вядучых кікбаксёраў Беларусі. Але прысутным у зале больш спадабаўся фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Неруш", апошнюю песню якога "Бывайце здаровы, жывіце багата" спявалі ўсе разам.

І напрыканцы — дыскатэка, што праводзілі студэнты філалагічнага факультэта. Што-што, а адпачываць студэнты ўмеюць выдатна.

Спортпляцоўка

Адкрыты кубак Рэспублікі Беларусь па гіравому спорту прайшоў у Светлагорску. Але з-за сесіі мацнейшыя гіравікі БДУ (Воўк, Гаркуша, Атрашкевіч, Заплешнікаў), якія ў апошнія гады перамагалі на розных рэспубліканскіх спаборніцтвах, у Светлагорск не трапілі. Аднак іншыя хлопцы не заплямілі гонар БДУ. У вазе 60 кг трэцім стаў Андрэй Стальмашонак (1 курс фізфака). У вазе 65 кг на другую прыступку ўзабраўся Павел Малы, член спартклуба. У вазе 75 кг трэцяе месца — за членам спартклуба Сяргеем Маскоўскім. Таксама трэцім, але ў вазе 80 кг стаў студэнт 3-га курса юрфака Дзмітрый Сергіеня. У вазе 90 кг перамог Алег Сямёнаў (5 курс гістфака), а трэцім тут быў юрыст Андрэй Нікончык (2 курс). І, нарэшце, у вазе звыш ста кілаграмаў — другое месца за членам спортклуба Мікалаем Сямёнавым.

# Узялі рэванш

Увосень нашы гіравікі ездзілі на матчавую сустрэчу ў Ліпецк, дзе прайгралі сваім ліпецкім візаві. У студзені гэтага года жыхары суседняй дзяржавы прыехалі з візітам у адказ і... не змаглі перамагчы нашых хлопцаў. Са студэнтаў БДУ першынствавалі першакурснік юрфака Аляксандр Воўк (80 кг.) і гістoрык Алег Сямёнаў (90 кг.).

*Матэрыялы рубрыкі падрыхтавала Вольга КАЗДЗЕРКА*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

*Газета надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» ВПП імя Я. Коласа 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны завул., 3. Ум. друк. арк. 1 Падпісана ў друк у 12.00*

*29 СТУДЗЕНЯ Зак. 1429. Т. 1000 экз.*

*Бясплатна*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ**

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*